**Саматой І.В.**

## ТЭМА ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў ТВОРЧАСЦІ АНАТОЛЯ ВЯЛЮГІНА

Тэма Вялікай Айчыннай вайны – адна з асноўных ў творчасці беларускіх пісьменнікаў-франтавікоў другой паловы XX стагоддзя, такіх, як А. Куляшоў, М. Лужанін, А. Пысін, А. Бачыла, М. Танк, К. Кірэенка, М. Аўрамчык, А. Русецкі, П. Прыходзька, П. Прануза. Пераважная частка спадчыны паэтаў першых гадоў вайны – творы выразнай грамадзянскай скіраванасці, адкрытае выказванне пачуццяў гневу, абурэння, пагарды да акупантаў. Сярод тых, каму пашчасціла пазбегнуць гібелі, хто з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўключыўся ў барацьбу з ворагам, – удзельнік Сталінградскай бітвы, ураджэнец вёскі Машканы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці, паэт, перакладчык, літаратуразнаўца, кінасцэнарыст Анатоль Вялюгін. Водсвет драматычных падзей, трагедыя і духоўная веліч народа-змагара кладзецца на старонкі яго паэтычных кніг "Салют у Мінску" (1948), "Негарэльская арка" (1949), "На зары займае" (1958), "Насцеж" (1960), "Адрас любві"(1964), "Верасовы ўзятак" (1974), "Песня зялёнага дуба" (1989), "З зялёнага каменя – сіняе пламенне" (1993), "Заклён на скрутны вір" (1995).

Вершы паэта – лірычна-публіцыстычная споведзь сведкі і ўдзельніка падзей пра ўласна перажытае, убачанае – не страцілі сваю першасную мастацкую вартасць і ў сённяшні дзень.

Вайна застала Анатоля Вялюгіна ў Мінску, дзе ён працаваў у рэдакцыі газет "Звязда", "Чырвоная змена", адначасова вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага ўніверсітэта. "Мяне вайна застала ў Мінску. Пад бомбавымі ўдарамі дрыжалі зямля і муры. У высокім доме над паркамі і скверамі мітусіліся птушкі. Хісталася трывожная ноч у пажарах. Сасмягла пакутная дарога, цягнучыся на Чэрвень, Беразіно і далей – па лясах, па густым, у зялёным дымку красавання жыце. Пешкам дабраўся да раз'езда Лычкоўскага – ёсць такі на перагоне Багушэўск – Віцебск. Там працаваў бацька; родныя верылі, што прыйду, чакалі, каб разам



Репозиторий ВГУ

падацца на ўсход. Пад калёсамі зарыпеў горкі шлях выгнання. Над ім ад зары да зары віселі "гарбатыя" фокеры. Лёзна, Рудня, лясы Духаўшчыны, Дарагабуж…

Ехалі, ішлі бежанцы. На запыленыя бальшакі, на матак і дзяцей, на машыны і на калгасныя статкі з-за хмар нырцавалі самалёты. У эшалон змаглі залезці аж у Вязьме. Я зразумеў, што вершы, калі ёсць патрэба, нараджаюцца, як і жыццё, усюды, нават на пуцявінах смерці"[2, с. 125].

Трагічны лёс народа на дарогах выгнання рэалістычна-дакладна, праз лагічна выверання мастацкія дэталі перадаў паэт у вершы "Я знаём з тваім воблікам":

Я знаём з тваім воблікам.
Бежанцы едуць… Зірні! Там
Папялістыя воблакі
Ці дымкі ад зенітак?
……………………..
Хмарай пыл –
За салдатамі,
Нема плачуць салдаткі.
Пад зялёнымі шатамі
Лазарэта палаткі.
Хмара пылу ці прысаку?..
Дымам пахнуць зярняты…
На сцягах нашых высака
Прыгавор табе ўзняты,
Вайна [1, с. 33].

На пачатку вайны напісаны аўтабіяграфічны верш "Бежанцы", які працягнуў мастацка-дакументальную хроніку трагічных падзей вайны. Эмацыйная ўзрушанасць, дынамізм і асацыятыўная вобразнасць дазволілі стварыць аўтару маштабныя замалёўкі батальных эпізодаў:

Рудня, лясы Духаўшчыны,
пад бомбамі
Дарагабуж…
Са скарбам брыдуць жанчыны –
Тысячы бежанскіх душ.
Попел руін на айчыне,
І травы ляглі на парог…
Смерць сінягубая стыне
Ў пыльнай пятлі дарог [1, с. 35].

Паэт чуйна адгукнуўся на перажыванні асірацелых дзяцей вайны ў вершах "Хлопчык з Ленінграда", "Балада аб уральскім танку". Перад намі карціны страчанага дзяцінства беларускага хлопчыка, які ў эвакуацыі працаваў на заводзе. З надзеяй, што знойдзе родную вёску, напісаў над байніцай танка такія словы:

Вярні маю родную
Вёску Суніцы! [1, с. 58]

Танк трапляе на фронт, дзе пачынаецца яго баявая біяграфія. Шмат давялося яму павая-ваць, перш чым спыніцца на вуліцы вызваленай вёскі:

Спацелы танкіст
Паказаўся над люкам.
Жалобная вёска.
Без вокан. Без гукаў.
І хрысціцца бабка
На зоркі, байніцы...
– Як вёска завецца?
– Сыночак, Суніцы… [1, с. 58]

Трагедыя маленства, асуджэнне вайны, як найвялікшага злачынства ў свеце, адлюстраваны ў кароткім лаканічным вершы "Лемантар вайны":

Мама мыла раму –
там, на ўроку рана.



Репозиторий ВГУ

Вісне ў небе “рама”,
Што забіла маму [1, с. 34].

З верасня 1941 года А. Вялюгін быў вымушаны эвакуіравацца і працягваць вучобу ў Свярдлоўскім педінстытуце, а пасля стаў курсантам авіяцыйнай школы, удзельнічаў у баях на Сталінградскім фронце. У 1942 годзе быў цяжка паранены і лячыўся ў шпіталі на Урале. Першаснае ўражанне, непасрэдны вопыт удзельніка падзей, асабістая прыналежнасць да “поля бітвы”, дзе вырашалася пытанне – быць ці не быць, сталі нагодай для стварэння такіх вершаў, як “Прывал”, “Няўзяты форт”, “Жыцця майго і смерці пераправы”, “Уральская восень”, “Танкаград”, “Віры нябёс”. У А. Вялюгіна, параненага ў час бітвы пад Сталінградам, з’явіліся радкі, дзе гаварылася аб зацiснутай у жмені акрываўленай прыволжскай зямлі, з якой неўзабаве прарасла чырвоная шыпшына:

Жыцця майго і смерці пераправы,
і Сталінград дагэтуль сняцца мне…
Зваліўся я, падкошаны жалезам,
абняў рукамі родную зямлю.
Яна прапахла дымам і палыннай
слязою нашых матак і дзяцей.
Калі я моцна сціснуў яе ў жменьцы –
сраз пальцы пырснула густая кроў!.. [1, с. 47]

Абарваныя вайной жыцці салдат асацыіруюцца то з васільком ( “На брацкіх магілах цвіце васілёк // вясёлае вока салдата.” [1, с. 43]), то з палыном (“Сумна пахне палын // на зарослых гарбатых руінах.” [1, с. 64]), то з рамонкам (“Жыццё, адвага і пакута // на скрыжаванні лютых трас. // Рамонак белы парашута… // І ён, пасечаны, пагас”. [1, с. 45]).

Аддаючыся патрыятычным і нацыянальным пачуццям, паэт узнаўляе ў свядомасці гістарычныя постаці (“Плач Яраслаўны”), вобразы беларускай сасны (“Сосны”), перапёлачкі ў жыцце (“Перапёлачка”). Драматычным паўстае вобраз сланечніка з верша “Сланечнік з перабітай галавой”, які вырастае ў паэтычны сімвал жыццястойкасці і няскоранасці роднай Беларусі:

Жоўты стэп…
Мартэны…
Краю любы,
Ты гарыш у памяці жывой,
Як сланечнік па-над стромай згубы
З сонечнай прабітай галавой [1, с. 35].

Трэба зазначыць, што ўслаўленне гераізму на фронце і ў тыле ворага не перашкаджала паэту цвяроза бачыць сутнасць трагедыі, усю глыбіню духоўных і маральных стратаў, кошт вялікага разбурэння, зруйнаваных гарадоў і паселішчаў, мільёнаў чалавечых ахвяраў. Гэту думку пацвярджаюць вершы “Ураджай перамогі”, “Магілы не маўчаць”, “Сумна пахне палын”, “Пакутніца”. У іх заўважаюцца канкрэтнасць, строгасць і, разам з тым, шчырае апяванне роднай зямлі, пранікнёная споведзь паэта-франтавіка.

Працуючы ў кінематографе, Анатоль Вялюгін не аднойчы звяртаўся да падзей Вялікай Айчыннай вайны ў сцэнарыях мастацкіх і дакументальных фільмаў “Рэха ў пушчы”, “Генерал Пушча”, Балада мужнасці і любові”, “Агонь”, “Я – крэпасць, вяду бой”, “Балада пра маці”. Вайна незваротна ўвайшла ў жыццё пісьменніка, істотна паўплывала на яго светапогляд, вызначыла асноўныя кірункі творчасці.

Літаратура

1. Вялюгін, А. Выбраныя творы ў двух тамах. / А. Вялюгін. – Мінск: Маст. літ., 1984. – Т. 1. – 413 с.
2. Пяцьдзесят чатыры дарогі. – Мінск: Маст. літ., 1964. – С. 114.

Репозиторий ВГУ